3.Nye, J.S. Soft Power. The Means to Success in World Politics / Joseph S. Nye – New York: Public Affairs, 2004. – 192 p.

# АДЛЮСТРАВАННЕ Ў АЙЧЫННЫХ ВУЧЭБНЫХ ВЫДАННЯХ ПА АГУЛЬНЫМ БІБЛІЯГРАФАЗНАЎСТВЕ ПРАКТЫКА-АРЫЕНТАВАНАГА ПАДЫХОДУ ДА ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

***Зыгмантович С.В.,*** *профессор кафедры библиотечно-информационной деятельности, кандидат педагогических наук, доцент*

***Саитова В.И.,*** *профессор кафедры библиотечно-информационной деятельности, кандидат педагогических наук, доцент*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сучаснай педагогіцы практыка-арыентаванае навучанне належыць да найбольш эфектыўных падыходаў прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі. Практыка-арыентаванае навучанне мэтаскіравана на фарміраванне ў студэнтаў сацыяльна-прафесійных кампетэнцый і павінна рэалізоўваць гарманізацыю тэарэтычнай (фундаментальнай) і практычнай падрыхтоўкі. Гэты баланс здольны забяспечыць рост якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў і іх гатоўнасць да стартавых умоў працоўнай дзейнасці.

У адукацыйныя праграмы падрыхтоўкі бібліятэчна-бібліяграфічных кадраў ва ўстановах вышэйшай адукацыі ўведзена вывучэнне дысцыплін агульнага бібліяграфазнаўства, якія фарміруюць прафесійную кампетэнтнасць будучых спецыялістаў па праблематыцы тэорыі, гісторыі, метадалогіі, арганізацыі, методыкі і тэхналогіі бібліяграфіі ў цэлым. Пералічаныя дысцыплінарныя кірункі прызначаны закласці ў студэнтаў фундамент ведаў аб такой складанай грамадскай сістэме, як бібліяграфія, фарміруюць здольнасці выяўляць і аналізаваць бібліяграфічныя з’явы, тлумачыць іх сутнасць, авалодваць бібліяграфічнымі сродкамі забеспячэння інфармацыйных патрэбнасцей грамадства, бачыць перспектывы развіцця бібліяграфіі, умець вырашаць бібліяграфічныя праблемы, рыхтаваць бібліяграфічныя прадукты і рэалізоўваць бібліяграфічныя паслугі.

Выкладчыкамі факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый бесперапынна вядзецца работа над удасканаленнем вучэбна-метадычнага забеспячэння бібліяграфазнаўчых дысцыплін. Адным з асноўных элементаў вучэбна-метадычнага забеспячэння

агульных бібліяграфазнаўчых дысцыплін з'яўляюцца айчынныя вучэбныя дапаможнікі па тэорыі і гісторыі бібліяграфіі, арганізацыі і тэхналогіі бібліяграфічнай дзейнасці. Стварэнне нацыянальнай вучэбнай літаратуры па дысцыплінах агульнага бібліяграфазнаўства – важны ўклад супрацоўнікаў ФІДК у справу фарміравання прафесійнай кампетэнтнасці бібліятэкараў-бібліёграфаў.

Даследчыкі аднадушны ў тым, што ў аснове практыка-арыентаванага падыходу ў адукацыі павінна быць разумнае спалучэнне фундаментальнасці адукацыі і прафесійна-прыкладной падрыхтоўкі спецыялістаў. Менавіта падручнікі ў сістэме вышэйшай адукацыі забяспечваюць фундаментальнасць падрыхтоўкі праз адлюстраванне найбольш каштоўнай часткі тэарэтычных, гістарычных, тэхналагічных, метадычных і арганізацыйных ведаў, запатрабаваных у сучаснай бібліяграфічнай дзейнасці. Значнасць падручнікаў па вучэбных дысцыплінах засноўваецца таксама на тым, што менавіта гэты від вучэбнай літаратуры выступае ў якасці мадэлі адукацыйнага працэсу, дазваляе забяспечыць сістэматычнасць прадстаўлення матэрыяла; характарызуецца упарадкаванай лагічнасцю падачы матэрыяла; стварае базу для першапачатковага засваення прафесійных ведаў і адначасова выступае інтэлектуальным інструментам для кіраўніцтва працэсам пазнавальнай дзейнасці студэнтаў па авалоданню зместам адукацыі і прадуктыўнаму выкарыстанню засвоеных ведаў у вырашэнні практычных задач рознай маштабнасці, накіраванасці і ступені цяжкасці.

Станоўчым з'яўляецца і той факт, што ў разглядаемых беларускіх вучэбных выданнях яскрава праяўляюцца прынцыпы інтэграванасці і дыферэнцыраванасці, транзітыўнасці. Інтэгратыўнасць рэалізуецца ў тым, што вучэбныя выданні ў цэлым грунтуюцца на дакументаграфічнай канцэпцыі бібліяграфазнаўства – прызнанай у сучаснай навуцы "лагічна бездакорнай сістэмай" [1, с.13], раскрываюць інфраструктурны характар бібліяграфіі, пры гэтым бібліяграфічнай дзейнасці бібліятэк надаецца прыярытэтная ўвага. Прынцып дыферэнцыраванасці праяўляецца ў фарміраванні сістэмы вучэбных выданняў, адпаведных структуры бібліяграфазнаўства і вучэбным дысцыплінам. Прынцып транзітыўнасці рэалізуецца праз праектаванне аўтарам падручніка навуковых ведаў па вучэбным дысцыплінам з улікам сучаснага практычнага вопыта бібліятэк і яго адпаведнасці прагназуемым кампетэнцыям будучых спецыялістаў у нарматыўных адукацыйных дакументах.

Наяўнасць вучэбных дапаможнікаў па ўсіх раздзелах агульнага бібліяграфазнаўства, падрыхтаваных на агульных метадалагічных падыходах, спалучэнне падручнікаў па гісторыка-тэарэтычных дысцыплінах з прыкладнымі дысцыплінамі тэхналагічнай накіраванасці дазваляюць забяспечыць фарміраванне сістэмнага набору сацыяльна-прафесійных бібліяграфічных кампетэнцый

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спецыялістаў, рэалізаваць аб'ектыўныя патрабаванні сучаснай "эканомікі ведаў", у якой больш значнымі для пасяховай прафесійнай дзейнасці лічацца не разрозненыя веды, а сістэмныя, з магчымасцю атрымання сінергетычнага эфекту ад іх выкарыстання ў працэсе навучання.

Суаднясенне патэнцыялу вучэбных дапаможнікаў з асноўнымі падыходамі рэалізацыі практыка-арыентаванай адукацыі (арганізацыя практыкі; выкарыстанне прафесійна-арыентаваных тэхналогій навучання; профільнасць выкладання) дазваляе разглядаць іх таксама ў кантэксце выкарыстання магчымасцей кантэкстнага прадстаўлення спецыяльных бібліяграфічных дысцыплін. Галоўнай рысай усіх разглядаемых вучэбных выданняў з'яўляецца адлюстраванне профільнай бібліяграфічнай праблематыкі ў суадносінах з сучаснай бібліяграфічнай практыкай у Беларусі.

Менавіта гэтымі характарыстыкамі вызначаецца першы нацыянальны вучэбны дапаможнік па дысцыпліне "Бібліяграфазнаўства. Тэорыя" Т.В. Кузьмініч [3]. Выданне істотна адрозніваецца ад падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў вядомых савецкіх і расійскіх вучоных А.П. Коршунава, М.Г. Вохрышавай, В.А. Факеева і інш. У выданнях названых аўтараў прадстаўлена іх аўтарская канцэпцыя, але іх мэтавая накіраванасць звязана з фарміраваннем кагнітыўнай складаючай падрыхтоўкі спецыялістаў. Напрыклад, мэта расійскага падручніка "Библиографоведение" А. П. Коршунава, Н. К. Лелікавай і Т. Ф. Ліхавід: "формирование у студентов теоретических представлений о сущности библиографии как общественного явления, основных закономерностях ее функционирования, структуре и месте в системе смежных областей деятельности, направлениях развития библиографоведения" [2, С. 9].

Важнай характарыстыкай беларускага вучэбнага дапаможніка з'яўляецца паліканцэптуальнасць адлюстравання бібліяграфіі як грамадскай з'явы, што дае магчымасць студэнтам асэнсоўваць бібліяграфічныя з'явы з пазіцый розных канцэпцый. Немэтазгоднасць абмяжоўваць разгляд тэарэтычных аспектаў бібліяграфіі адным падыходам, аўтар абаснавана тлумачыць не толькі дасягненнямі сучаснай тэарэтычнай думкі, але найперш тым, што "некаторыя кірункі, з'явы практычнай дзейнасці немагчыма ўпісаць у межы пэўнай канцэпцыі…" [3, С. 5]. У прапанаваным вучэбным матэрыяле значны пласт складаюць звесткі пра электронныя формы існавання бібліяграфічнай інфармацыі, якасна новыя формы бібліяграфічнага абслугоўвання, прыведзены шматлікія факты і прыклады з практыкі, асабліва Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, што надае выданню практычную скіраванасць.

Развіццю прафесійнага кругагляда, эрудыцыі і гуманістычнага светапогляда садзейнічае гісторыя бібліяграфіі, з багатым вопытам якой студэнты знаёмяцца ў працэсе вывучэння дысцыпліны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

"Бібліяграфазнаўства. Гісторыя". Гісторыка-бібліяграфічныя дысцыпліны з'яўляюцца адной з асноўных крыніц фактычнага і метадалагічнага забеспячэння іншых частак бібліяграфазнаўства. Новы вучэбны дапаможнік "Бібліяграфазнаўства. Гісторыя" В. І. Саітавай, В. Е. Лявончыкава і Т. В. Кузьмініч істотна адрозніваецца ад існуючых айчынных і замежных выданняў [4]. Гэта першае выданне, у якім галоўныя раздзелы выдзелены не ў адпаведнасці з агульнай гістарычнай перыядызацыяй, а на падставе асноўнага спосабу фіксавання ведаў на працягу пэўнага перыяду. Выкарыстаная перыядызацыя паказвае ўзаемаўплывы бібліяграфіі і сістэмы дакументных камунікацый, пераканаўча раскрываюцца асаблівасці захавання, перапрацоўкі і трансляцыі бібліяграфічнай інфармацыі (бібліяграфічных ведаў), фарміравання структур бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, асаблівасці яе аб'екта, жанравай разнастайнасці прадукцыі, эвалюцыі методыкі і тэхналогій бібліяграфавання і бібліяграфічнага абслугоўвання. На наш погляд, такая падача вучэбнага матэрыялу спрыяе ўменням выкарыстоўваць гісторыка-бібліяграфічныя веды ў прафесійнай практычнай і навуковай дзейнасці.

Асаблівае значэнне ў кантэксце практыка-арыентаванага падыходу мае раздзел "Бібліяграфія ў перыяд развіцця лічбавых камунікацый", пры вывучэнні якога студэнты знаёмяцца з патэнцыялам нацыянальнай бібліяграфіі для верыфікацыі аўтарства і інфармацыйнага рэсурса для стваральнікаў рознага праграмнага забеспячэння, з бізнес-мадэлямі рэсурсаў нацыянальнай бібліяграфіі, з сусветна вядомымі пастаўшчыкамі электронных інфармацыйных рэсурсаў па розных галінах ведаў, створанымі імі рэсурсамі і інфармацыйна-аналітычным інструментарыем, які выкарыстоўваюць бібліятэкі для прадстаўлення платных паслуг.

Адметнасць вучэбных дапаможнікаў па вучэбнай дысцыпліне "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай работы" вызначаецца яе мэтавай накіраванасцю як прыкладной дысцыпліны бібліяграфазнаўчага цыклу – тэхналагічнай накіраванасцю. Па свайму зместу, напаўняльнасці вучэбныя дапаможнікі – гэта "Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці" [5] і "Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі" [6] С.В. Зыгмантовіч – арыентаваны не толькі на перадачу ведаў праз раскрыццё арганізацыйных, тэхналагічных, метадычных асаблівасцей ажыццяўлення розных працэсаў бібліяграфічнай работы, але і на раскрыццё і засваенне вопыта практычнай дзейнасці. Адукацыя не можа быць практыка-арыентаванай без набыцця вопыта дзейнасці. Вопыт дзейнасці ў вучэбным дапаможніку па разглядаемай дысцыпліне набывае статус дыдактычнай адзінкі і традыцыйная трыада "знаниевого" падыходу дапаўняецца новай дыдактычнай адзінкай "веды – уменні – навыкі – вопыт дзейнасці". Вучэбныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дапаможнікі дапамагаюць праз вучэбна-пазнавальную дзейнасць пазнаёміцца не толькі з тэарэтыка-метадычнымі і тэхналагічнымі дасягненнямі ў сферы бібліяграфічнай практычнай дзейнасці, але і вопытам работы беларускіх бібліятэк, асаблівасцямі тэхналагічных працэсаў бібліяграфічнай дзейнасці, выкарыстоўваемымі сродкамі і метадамі, накіраванымі на атрыманне канкрэтных вынікаў работы ў выглядзе бібліяграфічных прадуктаў і паслуг, з лепшымі іх узорамі, якія прыводзяцца ў дадатках падручнікаў. Далейшае засваенне вопыта практычнай бібліяграфічнай дзейнасці ажыццяўляецца праз мадэляванне ўмоў, зместа рэальнай вытворчасці шляхам выкарыстання сучасных дзейнасных тэхналогій і метадаў навучання (лабараторных практыкумаў, дзелавых і імітацыйных гульняў, праектных метадаў, рознага рода практык і інш.).

Арыентаванасць на выкарыстанне практыка-арыентаванага падыходу да падрыхтоўкі вучэбнай літаратуры па агульным бібліяграфазнаўчым дысцыплінам звязана з яе ўдасканаленнем шляхам інтэграцыі вучэбных дапаможнікаў у вучэбна-метадычныя комплексы, праўтварэннем апошніх у адкрытыя вучэбныя сістэмы, якія дзякуючы новым электронным тэхналагіям могуць пастаянна ўзбагачацца; падрыхтоўкі вучэбных крыніц з новымі дыдактычнымі магчымасцямі за кошт пашырэння даведачнага апарату, ілюстрацыйнага матэрыялу, прадстаўлення комплекса заданняў пазнавальнага характару, для самастойнай работы і самакантролю студэнтаў ад чыста рэпрадукцыйнай накіраванасці да праблемна-пошукавых, творчых; рэкамендацыі дапаўняльных крыніц інфармацыі, у тым ліку электронных; арыентаванасці не толькі на крытэрыі трываласці засваення ведаў, крытычнай насычанасці інфармацыяй, але і на прынцыпы прадуктыўнасці навучання, звязаныя з падрыхтоўкай студэнтамі як адукацыйных прадуктаў, так і прадуктаў, якія могуць быць запатрабаваны і выкарыстаны ў вытворчай дзейнасці бібліятэк.


1. Справочник библиографа / науч. ред. Г. Ф. Гордукалова, Г. В. Михеева. – 4-е изд., испр. и доп. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – 768 с. – (Серия «Библиотека»).
2. Коршунов, О.П. Библиографоведение: учебник / О. П. Коршунов, Н. К. Леликова, Т. Ф. Лиховид ; под общ. ред. О.П. Коршунова. – Санкт-Петербург : Профессия, 2014. – 288 с.
3. Кузьмініч, Т. В. Бібліяграфазнаўства. Тэорыя : вучэб. дапам. / Т. В. Кузьмініч. – Мінск : Беларусь, 2012. – 215 с.
4. Саітава, В. І. Бібліяграфазнаўства. Гісторыя : вучэб. дапам. / В. І. Саітава, В. Е. Лявончыкаў, Т. В. Кузьмініч ; [пад агул. рэд. Т. В. Кузьмініч ; Мін-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў]. – Мінск : Нацыянальная бібліятэка Беларусі, 2017. – 248 с.
5. Зыгмантовіч, С. В. Арганізацыя і тэхналогія бібліяграфічнай дзейнасці : вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2006. – 325 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Зыгмантовіч, С. В. Кіраванне бібліяграфічнай дзейнасцю бібліятэкі: вучэб. дапаможнік / С. В. Зыгмантовіч. – Мінск : БДУ культуры і мастацтваў, 2009. – 123 с.

# УЧАСТИЕ СТУДЕНТОВ В МЕЖДУНАРОДНЫХ БИБЛИОТЕЧНЫХ ПРОЕКТАХ КАК ЭЛЕМЕНТ ПРАКТИКО-ОРИЕНТИРОВАННОЙ ОРГАНИЗАЦИИ ОБРАЗОВАТЕЛЬНОГО ПРОЦЕССА

***Касап В.А.,*** *профессор кафедры информационных ресурсов и коммуникаций, кандидат педагогических наук, доцент*

Практико-ориентированный подход к организации образования является перспективным направлением современной подготовки кадров на всех уровнях и ступенях образования. О его актуальности свидетельствуют принятые решения Министерства образования Республики Беларусь, проведенные научные исследования и опубликованные статьи [1, 2]. Согласно данному подходу, будущие специалисты должны свободно владеть профессией и быстро адаптироваться ко всем ее изменениям, уметь решать нестандартные задачи, демонстрировать творческую инициативу. Приобрести эти качества студенты смогут, прежде всего, осваивая их выполнение непосредственно в будущей профессиональной среде. Ученые по-разному подходят к исследованию возможностей достижения практического результата при использовании данного подхода. Одни из них считают необходимым создание практико-ориентированной среды как первейшего условия, другие − главным результатом видят формирование соответствующих профессиональных и социально-личностных компетенций, использование педагогических технологий обучения. Присутствует также точка зрения о необходимости воспитания профессионального самосознания будущих специалистов. Л.Г. Скульмовская и О.С. Кудинова [3] отмечают, что в высшей школе данный подход предполагает увеличение доли знаний, направленных на адаптацию студента к реалиям профессиональной среды в выбранном направлении профессиональной деятельности.

Наиболее часто исследуются такие направления реализации практико-ориентированного подхода как: его использование в процессе преподавания специальных дисциплин; при проведении производственной практики; в процессе написания курсовых и дипломных работ, при получении дополнительного образования. Уже есть опубликованные работы, в которых рассматривается эффект

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ